Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КРАСАВІКА 2013 г. СУБОТА № 74 (27439) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.



# «СТРЫЖНЯВАЯ ІДЭЯ ДЛЯ БЕЛАРУСІ — ІДЭЯ АБНАЎЛЕННЯ»

**Беларусь мае добры запас трываласці ва ўмовах зацяжнога сусветнага крызісу. Аб гэтым Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка заявіў, звяртаючыся з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу.**

2013 год з'яўляецца ключавым у гэтай пяцігодцы. «Калі азірнуцца назад, то старт пяцігодкі быў няпростым. Нас усё ж такі закрануў сусветны фінансава-эканамічны крызіс. Аднак нам удалося ў асноўным стабілізаваць сітуацыю. Сёння мы пераадолелі мяжу ў $500 сярэдняй заработнай платы па краіне. Справіліся з высокай інфляцыяй, супакоілі валютны рынак, забяспечылі прафіцыт бюджэту і захавалі на бяспечным узроўні золатавалютныя рэзервы», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ўсе поспехі Беларусі заўважаныя і адзначаныя ў свеце. Так, згодна са штогадовым рэйтынгам ААН, краіна ўвайшла ў лік першых пяцідзесяці дзяржаў свету па індэксе чалавечага развіцця, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам сярод дзяржаў СНД.

«Аднак падстаў для трывогі менш не стала. Свет вакол нас так і не выбраўся з зацяжнога крызісу. Драматычныя падзеі ў Грэцыі, на Кіпры — сумнае таму пацвярджэнне. Спрыяльных прагнозаў на будучыню практычна не відаць. Сусветная фінансавая і палітычная эліта ў разгубленасці. Простыя спосабы вырашэння праблем накшталт друкавання пустых долараў і еўра і мудрагелістых фінансавых маніпуляцый не даюць эфекту. А ісці на непазбежныя фундаментальныя рэформы не хапае волі і смеласці. Дарэчы, а ад нас яны ўсё патрабуюць рэформаў», — заўважыў беларускі лідар.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у такія перыяды сваёй гісторыі чалавецтва заўсёды звяртаецца да базавых эканамічных каштоўнасцяў — здольнасці забяспечыць сябе таварамі першай неабходнасці: прадуктамі харчавання, адзеннем і жыллём. «І ў гэтым мы маем добры запас трываласці, добрыя навыкі. Таму што Беларусь развівала рэальны сектар эканомікі, а не надзімала мыльныя фінансавыя бурбалкі», — падкрэсліў ён.

## ДАХОДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАВІННЫ ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦАВАЦЬ НА КРАІНУ

«Далейшы рост дабрабыту кожнага чалавека напрамую залежыць не толькі ад аператыўных мер, якія прымаюцца уладай, але і ад правільнасці выбару стратэгіі развіцця краіны. А ўлічваючы крайнюю ўзаемазалежнасць краін у сучасным свеце, мы павінны вельмі дакладна разумець, што адбываюцца глабальныя працэсы, і ведаць наша месца ў іх».

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад урадам і Нацыянальным банкам не менш важную задачу — даходы насельніцтва павінны эфектыўна працаваць на краіну. Пры гэтым ён асабліва адзначыў, што нарошчваць даходы за кошт грашовай эмісіі ніхто не будзе. «Зберажэнне сродкаў павінна быць максімальна прывабным менавіта ў нацыянальных актывах. Прычым не толькі ў дэпазітах, але і ў накапленнях для будаўніцтва кватэр і дамоў, асваення зямельных участкаў. Гэта значыць для вырашэння надзённых жыццёвых праблем, як бягучых, так і на перспектыву», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Заданняў па росце эканомікі ў 2013 годзе ніхто не адмяняў, заявіў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, вынікі працы эканомікі за I квартал бягучага года паказваюць у агульным станоўчыя вынікі, але толькі на тым фоне, на якім сёння развіваецца сусветная эканоміка. Тэмп росту валавога ўнутранага прадукту склаў 103,5%, інвестыцый у асноўны капітал — 112,5%, у тым ліку ў абсталяванне — амаль 122%.

«Захоўваецца станоўчае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. З месяца ў месяц расце валютная выручка. Золатавалютныя рэзервы сфарміраваныя ў памеры больш як двухмесячнага імпарту. Стабільная сітуацыя на ўнутраным валютным рынку — прапанова замежнай валюты перавышае попыт на ўсіх яго сегментах (з пачатку года Нацыянальным банкам набыта амаль $600 млн), — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка хоць яшчэ і застаецца высокай, але з улікам зніжэння інфляцыі зменшана да 27% гадавых. Гэта значыць, крэдытныя рэсурсы для рэальнага сектара эканомікі паступова становяцца больш даступнымі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, нягледзячы на такую станоўчую дынаміку, актыўна растуць запасы гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў, прычым як у абсалютным, так і ў адносным выражэнні. Так, на 1 красавіка на складах сабралася гатовай прадукцыі больш чым на Br30 трлн, што практычна ў два разы больш, чым было год таму. «У чым справа? Я свайго патрабавання да ўрада быць адным вялікім Міністэрствам гандлю не адмяняў. І папрашу неадкладна падключыць мясцовыя органы ўлады і выдаць канкрэтны вынік па разгрузцы складоў!» — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

«І галоўнае, ніхто не адмяняў заданняў па сёлетнім росце эканомікі. І з гэтымі аб'ёмамі прыросту ўрад і парламент пагадзіліся добраахвотна. Калі ласка, займіцеся выкананнем сваіх жа ўласных рашэнняў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Запомніце: сёння няма ніякіх падстаў, каб расслабіцца. Так, крызісныя з'явы ў нас быццам бы адступілі, і мы паслядоўна рухаемся наперад. Але варта нам хоць у малой ступені расслабіцца, як жыццё неадкладна і жорстка пакарае нас за гэта. Як кажуць у народзе, ударыць па галаве і вельмі моцна. Таму што ў асноўных спажыўцоў нашых тавараў — Еўрасаюза і Расіі — рынкі аселі, сітуацыя вельмі складаная».

## ТРЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ ДЛЯ АБНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

«Ключавая праблема нашай эканомікі — канкурэнтаздольнасць айчынных тавараў. І каб выйграваць у цяжкай канкурэнтнай вайне на сусветным рынку, мы павінны пастаянна абнаўляць веды, тэхналогіі, абсталяванне, сістэмы кіравання. Таму сёння галоўная, стрыжнявая ідэя для Беларусі — ідэя абнаўлення», — сказаў кіраўнік дзяржавы .

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што абнаўленне — гэта не адмова ад існуючай у Беларусі мадэлі і ранейшага шляху, а новы этап у развіцці. «Мы даўно да гэтага падышлі, і не проста падышлі, а па некаторых асноўных напрамках значна прасунуліся ў мадэрнізацыі. Мы не толькі абнаўляем старыя, але і будуем новыя прадпрыемствы», — сказаў ён.

«Мы павінны абаперціся на тры магутныя нацыянальныя праекты, якія дазволяць абнавіць дзяржаву. Першы праект — гэта мадэрнізацыя эканомікі. Другі — інфарматызацыя грамадства. Трэці — падтрымка моладзі і яе маштабнае прыцягненне да дзяржаўнага будаўніцтва», — заявіў Прэзідэнт.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на фінансавы крызіс, інтэлектуальны прагрэс у свеце не запаволіўся, а толькі паскараецца, набіраючы каласальныя абароты. «Перакананы, што менавіта новыя навуковыя вынаходкі, а не мудрагелістыя фінансавыя схемы запусцяць «матор» сусветнай эканомікі, які часта глохне. Глабальны вір новых ідэй, тэхналогій і вынаходак зацягвае ў сябе і Беларусь. Нягледзячы на тое, што мы сярэдняя па еўрапейскіх мерках дзяржава, пазбаўленая якіх бы там ні было планетарных амбіцый, мы ўжо не можам думаць аб нашым лёсе асобна ад агульнасусветных працэсаў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Наш выбар невялікі. Мы можам ці прыстасавацца да бурных перамен, або застацца на абочыне гісторыі. Іншага не дадзена».

На думку кіраўніка дзяржавы, у новага часу ёсць тры галоўныя патрабаванні: хуткасць, гнуткасць і творчасць. Гэта звязана са светам, які імкліва мяняецца, са з'яўленнем новых ідэй і тэхналогій, з неабходнасцю пастаянна прыстасоўвацца да гэтых змяненняў і прапаноўваць нешта новае. «Той, хто ўвесь час капіруе, той заўсёды асуджаны на адставанне. Таму любая маладая нацыя павінна, з аднаго боку, вучыцца ў навакольнага свету, а з іншага — заўсёды памятаць пра тое, што на нейкім этапе трэба быць гатовым прыўнесці ў свет нешта сваё. Толькі творчасць можа забяспечыць прарыў у групу лідараў», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

## АКНО МАГЧЫМАСЦЯЎ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт бачыць «акно магчымасцяў» для выхаду Беларусі на новую хвалю эканамічнага росту. Кіраўнік дзяржавы назваў цяперашні этап сацыяльна-эканамічнага развіцця асаблівым, які патрабуе паскораных тэмпаў працэсу мадэрнізацыі. «Справа ў тым, што змена дамінуючых тэхналагічных укладаў, якая адбываецца сёння, адкрывае «акно магчымасцяў» для паспяховага выхаду на новую хвалю эканамічнага росту. Менавіта ў падобныя перыяды буйнамаштабных глабальных тэхналагічных зрухаў «акно магчымасцяў» дазваляе асобным краінам вырвацца наперад і здзейсніць эканамічны рывок. І мы павінны такім чынам і такім вопытам скарыстацца», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гэтыя пытанні абмяркоўваліся ў сакавіку на пасяджэнні Савета Міністраў. «Хай нават у жорсткай і суровай форме. І, па-мойму, зразумеўшы адзін аднаго, мы дамовіліся», — заўважыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы засяродзіў увагу на тым, што быў устаноўлены крытэрый эфектыўнасці мадэрнізацыі — дасягненне гадавой выручкі ад рэалізацыі прадукцыі на аднаго занятага не менш як $60 тыс. «Гэта галоўны, фундаментальны крытэрый для кожнага. $60 тыс. на брата — дзякуй: ордэны і медалі. Але ад прададзенай прадукцыі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вызначаны і неабходныя ўмовы, якія ўраду, Нацыянальнаму банку і губернатарам варта стварыць для паспяховай мадэрнізацыі.

«Пераконваць каго-небудзь у важнасці мадэрнізацыі не трэба. Яе неабходнасць абсалютна відавочная, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Трэба ўдасканальваць усе працэсы, не кажучы ўжо пра базу, пра падмурак любой дзяржавы і грамадства — эканоміку. Гэта натуральны, можна сказаць, аб'ектыўны працэс развіцця грамадства і дзяржавы».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што сёння галоўны партнёр Беларусі па Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы — Расія ўжо ўступіла ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, а другі — Казахстан — на парозе гэтага ўступлення. «Гэта значыць, мы ўжо фактычна працуем у жорсткіх умовах глабальнай канкурэнцыі. Таму іншага выбару, чым паскорана абнаўляць эканоміку, у нас проста няма», — лічыць Прэзідэнт.

«Праўда, нашы апаненты заяўляюць, што ўлады звярнуліся да новага перадвыбарчага лозунга. І, маўляў, усё абмяжуецца пустымі размовамі. Яны прыходзяць да дзіўнай высновы: нібыта патэнцыял росту канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі вычарпаны і ідзе дэградацыя нашай эканомікі. Таму, маўляў, трэба не мадэрнізаваць яе, а проста выкінуць і прыняць кардынальна іншую мадэль, — сказаў Прэзідэнт. — Але гэта мы ўжо з вамі праходзілі. Я ўжо за гэтыя гады некалькі разоў праходзіў, такія ўрокі я ведаю. Мне прапаноўвалі: не трэба новы камбайн, не трэба новая сельгастэхніка, мы купім усё за мяжой, гэтыя прадпрыемствы трэба ліквідаваць, за капейкі прадаць, яны нам проста не патрэбныя. Прайшоў час, мы пайшлі іншым шляхам. І што сёння атрымліваецца? Тыя, хто ад нас гэтага патрабаваў, гэта прапаноўваў, ужо кажуць: якія беларусы малайцы. Хтосьці шэптам кажа дзесьці ў дыпламатычных кулуарах, хтосьці — за межамі нашай краіны пра гэта мямліць... А мы ж з вамі бачым, што мы мелі рацыю, ідучы гэтым шляхам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Новых ідэй у нашых апанентаў, ворагаў, пятай калоны няма. Вось зноў дасталі гэтую старую «зброю»: давайце ўсё закрыем і ліквідуем. Добра, уявіце сабе: сёння зачынілі, заўтра — што? Заўтра што будуць рабіць людзі? Дзе яны будуць атрымліваць заработную плату? — сказаў Прэзідэнт. — Словам, старыя песні на тэму «до основанья, а затем...», якія ў гісторыі ўжо не раз перакульвалі краіны ў хаос сацыяльных узрушэнняў і эканамічнага заняпаду. Як гаворыцца, ламаць не будаваць — розуму не трэба.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Наш шлях — не разбурэнне, а стварэнне. Не Манілаўскія летуценні, а рэальныя праекты сістэмнага развіцця эканомікі, удасканалення і няўхільнага нарошчвання нашага вытворчага патэнцыялу». Мадэрнізацыя з'яўляецца аб'ектыўным патрабаваннем жыцця, а не манілаўшчынай або выдумкай Лукашэнкі. «Мяркую, што лепш за ўсё гэта даказаць нашым апанентам на канкрэтных прыкладах таго, што зроблена і што трэба будзе зрабіць. Хоць я яшчэ раз хачу падкрэсліць, што мадэрнізацыя ў краіне пачалася даўно. Уступленне Расіі ў СГА, гэтая сітуацыя проста штурхае нас хутчэй мадэрнізацыю завяршыць», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў сельскай гаспадарцы мадэрнізацыя ідзе дзве пяцігодкі, за гэты час у Праграму адраджэння вёскі інвесціравана $40 млрд, сёлета завершыцца праграма мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі. «Вазьміце энергетыку, пра якую мы казалі нядаўна і дзе вельмі шмат бачылі недахопаў. У энергетыку за гэтыя гады мадэрнізацыі ўкладзена $7 млрд. Так, сапраўды, з'явілася новая энергетыка. Пра недахопы мы гаварылі, і міністр на гэтым «страціў» галаву. Але я папярэджваў усіх», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама прывёў у якасці прыкладаў мадэрнізацыі нафтаперапрацоўку, у прыватнасці, стварэнне фактычна новага прадпрыемства на Наваполацкім нафтаперапрацоўчым заводзе. «І сёння нашы партнёры, якія здабываюць нафту, стаяць у чарзе, каб трапіць на нашы НПЗ», — сказаў Прэзідэнт.

«Вось што такое мадэрнізацыя. Таму новы прэзідэнцкі праект (ну, што вы яго мне прыпісалі, хоць не адзін тут я герой, усе мы працавалі і працуем на мадэрнізацыю) — гэта добры праект», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што мадэрнізацыя — гэта задача любога грамадства. У сувязі з гэтым ён прывёў у прыклад Расію, якая таксама ідзе па шляху мадэрнізацыі не толькі эканомікі, але і ўсёй краіны.

Нам неабходна паскорыць выхад усіх сельгасарганізацый на бясстратную працу. «Найважнейшая задача ў 2013 годзе — забяспечыць фінансавую ўстойлівасць гаспадарак, паскорыць іх выхад на самафінансаванне. І ў першую чаргу зрабіць усё, каб не было стратных арганізацый», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Стратэгія развіцця сельскагаспадарчай галіны ў рэспубліцы вызначана. «Адмаўляцца ад яе мы не маем намеру», — сказаў Прэзідэнт.

«Шчыра скажу, мяне хвалююць не столькі аб'ёмныя паказчыкі, колькі якасныя характарыстыкі стану спраў у галіне, — прызнаўся Прэзідэнт. — Мы навучыліся збіраць нядрэнныя ўраджаі, стабільна павялічваем вытворчасць валавой прадукцыі (тэмп росту ў 2012 годзе — 117,5%), давялі экспарт харчавання амаль да $5 млрд за мінулы год (гэта 125% да ўзроўню 2011 года)». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў заклапочанасць тым, што да гэтага часу не ўдаецца выйсці на бясстратную працу ўсіх гаспадарак.

«Без уліку дзяржаўнай падтрымкі больш за 500 арганізацыі (або трэць ад агульнай колькасці) з'яўляюцца стратнымі. Вельмі высокая закрэдытаванасць аграрнага сектара. Гэта сур'ёзныя мінусы ў рабоце галіны», — падкрэсліў Прэзідэнт. Таму, па яго словах, найважнейшая задача ў гэтым годзе заключаецца ў тым, каб забяспечыць фінансавую ўстойлівасць гаспадарак, паскорыць іх выхад на самафінансаванне. І ў першую чаргу зрабіць усё, каб не было стратных арганізацый. «Гэта істотна палепшыць эканоміку ўсёй аграрнай галіны, дапаможа павысіць узровень даходаў вяскоўцаў», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, дынамічнаму развіццю аграрнага сектара павінна паслужыць тэхналагічнае абнаўленне вытворчасці, удасканаленне метадаў гаспадарання і структурныя змены. «Мінсельгасхарчу, органам мясцовай улады ў бліжэйшыя год-два трэба, па-першае, стварыць у кожным раёне буйны агракамбінат, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — У ім неабходна аб'яднаць шэраг сельскагаспадарчых арганізацый і перапрацоўчых прадпрыемстваў, каб забяспечыць завершаны цыкл вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі. Прыклады эфектыўнай дзейнасці ў нас ёсць. Гэта агракамбінаты «Сноў», «Дзяржынскі», «Ждановічы» і шэраг іншых».

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.



## ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 3 млн чалавек**

*возьмуць удзел у рэспубліканскім суботніку, які сёння пройдзе ў Беларусі, паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада. У кожным рэгіёне Беларусі зацверджаны графікі мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскага суботніка, вызначаны асноўныя аб'екты, на якіх будуць арганізаваны работы па добраўпарадкаванні. Палова грашовых сродкаў, заробленых на суботніку, застанецца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама і будзе накіравана на падрыхтоўку да летняга сезона дзіцячых аздараўленчых лагераў, а таксама мерапрыемствы па правядзенні Года беражлівасці. Другая палова вырučаных сродкаў будзе накіравана Міністэрству аховы здароўя на набыццё спецыяльных аўтамабіляў хуткай медыцынскай дапамогі з поўнай камплектацыяй медыцынскай тэхнікай і іншым абсталяваннем.*

У сувязі з правядзеннем **20 красавіка гэтага года рэспубліканскага суботніка** публікуем нумар бягучага (разліковага) рахунку, на які будуць пералічвацца заробленыя на суботніку грашовыя сродкі.

**Атрымальнік:** Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, УНП 100691903;

**Банк:** Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, г. Мінск;

**Код банка:** 153005042;

**Нумар рахунку:** 3640900000088 у беларускіх рублях.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.04.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8640,00 ▼ |
| Еўра | 11290,00 ▼ |
| Рас. руб. | 274,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1060,97 ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 13° |
| Віцебск | + 13° |
| Гомель | + 19° |
| Гродна | + 13° |
| Магілёў | + 15° |
| Мінск | + 14° |

## КОРАТКА

Больш за 40 дадатковых цягнікоў міжрэгіянальных ліній будуць курсіраваць у майскія святы па Беларусі па такіх папулярных напрамках, як Мінск—Брэст, Мінск—Гомель і Мінск—Віцебск.

Збор або знішчэнне занесеных у Чырвоную кнігу раслін караецца штрафам ад 2 да 5 мільёнаў рублёў. У Чырвоную кнігу Беларусі ўключаны такія расліны, як сон лугавы, ветраніца лясная, першацвет высокі, пярэсна еўрапейская, фіялка багнавая, сон раскрыты.

Адкрыццё комплексу «Чыжоўка-Арэна», што стане другой пляцоўкай хакейнага ЧС-2014 у Мінску, запланавана на 9 верасня гэтага года і будзе прымеркавана да Дня горада.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ААН НАЗВАЛА СІТУАЦЫЮ Ў СІРЫІ ГУМАНІТАРНАЙ КАТАСТРОФАЙ

Канфлікт паміж уладамі Сірыі і паўстанцамі, які працягваецца больш за два гады, прывёў да гуманітарнай катастрофы ў краіне. Пра гэта заявіла намеснік генеральнага сакратара ААН па гуманітарнай дапамозе Валеры Амас падчас выступу ў Савеце Бяспекі. «Гарады і вёскі ляжаць у руінах, пастаянна адчуваецца недахоп вады і электрычнасці, гуманітарная дапамога раскрадаецца, а ўрачам часам даводзіцца апераваць без анестэзіі. Ім нават не хапае медыцынскіх нітак для зашывання ран», — распавяла Валеры Амас. Па звестках ААН, за час канфлікту ў Сірыі загінула каля 70 тыс. чалавек, большасць з якіх мірныя грамадзяне. Колькасць уцекачоў з Сірыі ў суседніх краінах перавысіла 1 млн чалавек, каля паловы з іх дзеці, прычым большасць — маладзейшыя за 11 гадоў. Да канца 2013 года агульная колькасць сірыйскіх бежанцаў у суседніх краінах можа дасягнуць 3,5 млн чалавек. У выніку баявых дзеянняў, якія ахапілі 60% тэрыторыі Сірыі, разбурана палова бальніц, чвэрць школ. У тэрміновай гуманітарнай дапамозе маюць патрэбу звыш 5 млн сірыйцаў.

### У ГЕРМАНІІ ЗНІШЧАЦЬ 27 ТЫС. ІНДЫЧАК У СУВЯЗІ З ВЫЯЎЛЕННЕМ ВІРУСА ПТУШЫНАГА ГРЫПУ H7

У Ніжняй Саксоніі на дзвюх птушкафермах выяўлена лёгкая форма птушынага грыпу — H7, у сувязі з чым прынята рашэнне знішчыць каля 27 тыс. індычак. Як паведамляе міністэрства сельскай гаспадаркі і абароны правоў спажыўцоў, небяспекі для здароўя чалавека такі від віруса не ўяўляе. У радыусе 1 км вакол гэтых фермаў уведзена санітарная зона.



### ЗАХОДНЯЯ ДЫЕТА — ДОБРЫ СПОСАБ НЕ ДАЖЫЦЬ ДА СТАРАСЦІ

Тыповая заходняя дыета — з вялікай колькасцю тлушчу і цукру — небяспечная не толькі для здароўя, але і для жыцця. Людзі, якія яе прытрымліваюцца, маюць больш шанцаў раней часу апынуцца ў магіле, гаворыцца ў новым даследаванні, апублікаваным у The American Journal of Medicine. Група навукоўцаў правяла даследаванне, вывучыўшы даныя больш за 5000 брытанскіх дзяржслужачых — 3775 мужчын і 1575 жанчын. Сярэдні ўзрост падыспытных складаў 51 год. У 2009 годзе даследчыкі падвялі вынікі і высветлілі, што прыкладна тры чвэрці ўдзельнікаў (73%) перажылі нармальнае старэнне, 4% — ідэальнае, не абцяжаранае ніякімі хранічнымі хваробамі ці пагаршэннем фізічных, разумовых і псіхічных здольнасцяў. 13% перажылі нефатальныя сардэчна-сасудзістыя захворванні, такія як інсульт ці інфаркт. Яшчэ амаль 3% памерлі ад аналагічных праблем. 7% памерлі па іншых прычынах. Паводле слоў даследчыкаў, тыя, хто прытрымліваўся заходняй дыеты, мелі ўдвая менш шанцаў на здаровую старасць. У той жа час адмова ад тыпова «заходняга набору прадуктаў» (белы хлеб, масла, смятана, чырвонае мяса) павялічвала верагоднасць безхваробнага старэння і зніжала рызыку заўчаснай смерці.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ASSOCIATED PRESS АБ'ЯВІЛА БОСТАНСКІХ ТЭРАРЫСТАЎ РАСІЯНАМІ

**Паліцыі ўдалося выявіць і знішчыць аднаго з падазраваных у здзяйсненні тэракта на фінішы Бостанскага марафону, у выніку якога загінулі трое і было паранена каля 180 чалавек.**

Меркаваны тэрарыст загінуў у перастрэлцы з паліцыяй, перадае Reuters. Ён памёр ад атрыманых траўмаў у шпіталі, удакладняе Associated Press. На месцы падзей знайшлі доказы, якія пацвярджаюць дачыненне загінулага да тэракта, — выбухоўку і скараваркі, падобныя да тых, у якія былі закладзены элементы бомбы на Бостанскім марафоне, паведамляе тэлеканал NBC. Другі магчымы саўдзельнік злачынства, як мяркуюць, хаваецца ў прыгарадзе Бостана.



Мяркуецца, што менавіта гэтыя маладыя людзі напярэдадні распачалі страляніну на тэрыторыі кампуса Масачусецкага тэхналагічнага інстытута ў прыгарадзе Бостана Кэмбрыджы, дзе быў забіты паліцэйскі. Вызначаны асобы падазраваных — гэта 19-гадовы Джахар Царнаеў і 26-гадовы Тамерлан Царнаеў, піша Reuters са спасылкай на прадстаўніка Агенцтва нацыянальнай бяспекі. Па звестках AP, браты родам з «рэгіёна побач з Чачнёй».




## 23 КРАСАВІКА «ЗВЯЗДА» Ў МАСТАХ!

Вясна імкліва ўступае ў свае правы. А хутка і лета — пара водпускаў, канікул, падарожжаў. Безумоўна, паехаць адпачываць усім разам, сям'ёй, што можа быць лепш? А калі так не атрымліваецца?

**Падчас «Выязной прыёмнай»,** якая пройдзе **23 красавіка** на Гродзеншчыне — у Мастах, «Звязда» плануе ўзняць менавіта тэму летняга адпачынку і аздараўлення. **З 11 да 13 гадзін** у Мастоўскім райвыканкаме на пытанні па гэтай праблематыцы адкажуць спецыялісты Міністэрства адукацыі і Упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, прадстаўнікі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. А **з 14 да 16 гадзін прыём грамадзян** працягнецца на тэрыторыі Адкрытага акцыянернага таварыства «Мастоўдрэў».

Прыходзьце! Мы чакаем вашых пытанняў і прапаноў.

# «СТРЫЖНЯВАЯ ІДЭЯ ДЛЯ БЕЛАРУСІ — ІДЭЯ АБНАЎЛЕННЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па-другое, на думку кіраўніка дзяржавы, для нарошчвання экспартнага патэнцыялу галіны неабходна ў гэтым годзе завяршыць стварэнне прадуктовых кампаній. Пры гэтым такія інтэграваныя структуры павінны быць нацэлены на пашырэнне рынкаў збыту прадукцыі, як у блізкім, так і ў далёкім замежжы. «Але без перагібаў», — запатрабаваў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ніякага валюнтарызму ў гэтым працэсе быць не павінна. «Пры аб'яднанні жабракоў плюсоў не атрымаем. Трэба шукаць, за кошт чаго жабрак заўтра стане багатым. І толькі ў гэтым кірунку прадпрымаць нейкія дзеянні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Па-трэцяе, з улікам сучасных запытаў харчовага рынку і магчымасці атрымліваць вялікі прыбытак неабходна мяняць структуру нашага аграрнага экспарту», — падкрэсліў Прэзідэнт. Для гэтага, адзначыў ён, неабходна не проста надаць прыярытэт развіццю жывёлагадоўлі, які дае 90% экспарту прадуктаў харчавання, але галоўнае — павялічыць глыбіню перапрацоўкі сыравіны. «Хопіць вазіць на рынкі тушы і паўтушы — трэба прадаваць канчатковую прадукцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ПРАЗРЫСТАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі можа быць прададзена любое прадпрыемства, але ніякіх кулуарных здзелак тут ніколі не будзе. «Прынцыпы агучаны не адзін раз: хочаш купіць — плаці рынкавую цану плюс вазьмі абавязацельствы ўкласці грошы ў вытворчасць, захаваць працоўныя месцы і забяспечыць людзям дастойную заробатную плату», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што прыватызацыя — гэта не панацэя ад усіх бед. «МВФ, Еўрасаюз, антыкрызісныя фонды — усе кажуць: давай прыватызацыю, прадавай дзяржпрадпрыемствы. Але не трэба нас вельмі моцна нахіляць, на продаж па дэмпінгавых цэнах Беларусь не пойдзе. «Нармалізуецца на рынку сітуацыя — тады будзем абмяркоўваць гэтае пытанне. Я нічога не прыдумаў — Еўропа і Амерыка кажуць, што цяпер нявыгадна прадаваць актывы», — запэўніў Прэзідэнт.

«Калі хтосьці спрабуе выкарыстоўваць гэтую сітуацыю і «раздзярбаніць» краіну — гэта не са мной», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, у Беларусі ёсць рынкі, і айчынная прадукцыя не саступае па якасці і цане таго, што выпускаюць будучыя акцыянеры. Пры гэтым ён прывёў у прыклад МАЗа, дзе ёсць свая праграма мадэрнізацыі. «Я пытаюся ў патэнцыйных акцыянераў: колькі вы ўкладзяце ў мадэрнізацыю МАЗа, калі б вы сюды прыйшлі? Але ў іх грошай няма. Да таго ж мяне пачынаюць інфармаваць, што за імі стаяць замежнікі з Германіі і Амерыкі, якія проста будуць зацікаўлены ў тым, каб МАЗ апусціць, закрыць», — паведаміў Прэзідэнт. Аднак, на яго думку, для Беларусі на буйным машынабудаўнічым заводзе недастаткова выпускаць паўвось або кабіну варыць уручную. «Не, дарагія мае, мяне выбраў народ краіны, і я на гэтую бандыцкую акцыю не пайду», — заявіў ён. «Жадаеце стварыць сумесную кампанію — давайце створым, прапрацуем 3-5 гадоў і паглядзім, што атрымаем. Калі мы будзем бачыць плюсы, то на гэта пойдзем. Я ў апошні раз і абсалютна канкрэтна адказаў на пытанне прыватызацыі замежнымі інвестарамі і нашымі ўнутранымі беларускіх прадпрыемстваў», — дадаў беларускі лідар.

Па яго словах, краіне патрэбна такая прыватызацыя і такія інвестары, якія забяспечаць пашырэнне таварных рынкаў, стварэнне новых вытворчасцяў і дадуць добрую зарплату. «Нам не патрэбны тыя, пры якіх працоўны калектыў застаецца з мізэрнай заработнай платай, а ўсе грошы забірае купка акцыянераў», — канстатаваў ён, адзначыўшы, што раўняцца трэба на сумесны праект са швейцарскай кампаніяй «Штадлер». Гэтая кампанія з'яўляецца адным з вядучых еўрапейскіх вытворцаў чыгуначнага рухомага саставу і сумесна з «Белкамунмашам» стварыла прадпрыемства па вытворчасці ў Мінскай вобласці чыгуначнага і гарадскога пасажырскага электрычнага транспарту.

«Зусім хутка з гэтай пляцоўкі пачнуць выходзіць выдатныя сучасныя электрацягнікі і гарадскі электрычны транспарт беларускай вытворчасці, які па якасці не саступіць швейцарскаму», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на тое, што, хоць завод яшчэ толькі будуецца, ужо маецца прыстойны замежны партфель заказаў на прадукцыю. «Больш за тое, наша супрацоўніцтва з уладальнікам кампаніі Петэрам Шпулерам на гэтым не спыняецца. Пры яго ўдзеле мы вядзём перамовы аб вытворчасці спецтэхнікі для камунальнай гаспадаркі з яшчэ адным швейцарскім вытворцам», — праінфармаваў кіраўнік дзяржавы. Так, ёсць планы адпаведнага інвестара, які гатовы наладзіць у Беларусі вытворчасць не засвоенай для краіны камунальнай тэхнікі, на якую ёсць вялікі попыт у свеце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія інвестары вітаюцца на беларускай зямлі.

## ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ — МАШТАБНЫ АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРАЕКТ

Адміністрацыі Прэзідэнта, ураду і аператыўна-аналітычнаму цэнтру неабходна распрацаваць прапановы аб структуры, якая цэнтралізавана займалася б інфарматызацыяй у Беларусі, заявіў Прэзідэнт. «У гэтай сувязі даручаю ўраду сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта і ААЦ прадумаць і ўнесці прапановы аб канкрэтнай структуры з усімі неабходнымі паўнамоцтвамі, на якой будуць замыкацца ўсе працэсы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт растлумачыў, што сусветны вопыт ясна паказвае — паспяховую інфарматызацыю можна правесці не разрознена па асобных ведамствах, а толькі цэнтралізавана, па адзіным плане і з адзінага цэнтра.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Інфарматызацыя павінна стаць маштабным агульнанацыянальным праектам. Яна абавязана ахапіць усе без выключэння сферы нашага жыцця — ад анлайн-адукацыі і тэлемедыцыны да камп'ютарных сістэм уліку расходу паліва. Інфармацыйныя тэхналогіі, як нервовая сістэма, павінны звязаць усё разам — ад эканомікі і адукацыі да кіравання і бяспекі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што інфарматызацыя здольная забяспечыць некалькі стратэгічных прарываў. У тым ліку яна можа кардынальна вырашыць праблему дэбюракратызацыі за кошт маштабнага ўкаранення дзяржаўных электронных паслуг, гэта значыць электроннага ўрада. Таксама магчыма стварыць прынцыпова новую сістэму ўліку і кантролю: ад маніторынгу фінансавых патокаў да кантролю за перамяшчэннем тавараў. Яшчэ адзін момант — дадатковы эфект у энергазберажэнні. Інфарматызацыя можа дапамагчы ажыццявіць тэхналагічны прарыў у сферах гандлю, адукацыі, медыцыны і бяспекі, а таксама даць значны прырост для развіцця ўнутранага рынку паслуг. «Важна разумець асаблівасць IT-сферы — яна дае высокія прыбыткі пры мінімальных матэрыяльных выдатках», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, на думку Прэзідэнта, Беларусь апынулася ў сітуацыі шаўца без ботаў. «Беларускія праграмісты працуюць на Захад, у той час як сама Беларусь адстае ў IT-сферы», — адзначыў ён. Таксама Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў краіне стартаваў праект па будаўніцтве сетак LTE стандарту 4G. «На жаль, тут мы не ідзём наперадзе планеты ўсёй, а толькі даганяем. У многіх краінах гэтыя сеткі паспяхова дзейнічаюць, а мы толькі прыступаем да іх стварэння», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў з гэтай нагоды, што лепш позна, чым ніколі, але дрэнна тое, што ўрад своечасова не ўбачыў гэтага. «А калі і ўбачыў, то прапаноў не было. Прапануй — заўтра давядзецца самому рэалізоўваць», — адзначыў ён. У выніку ініцыятарамі праекта сталі не ўрад і не Мінсувязі, а зусім іншыя структуры.

Прэзідэнт падкрэсліў, што невялікая дзяржава не можа брацца адразу за ўсе, і Беларусі патрэбна свая ніша ў глабальнай эканоміцы ведаў. «У свеце даўно і справядліва адзначаюць высокую якасць нашай адукацыі ў галіне IT-тэхналогій», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## СЁЛЕТА ДАХОДЫ ЛЮДЗЕЙ БУДУЦЬ РАСЦІ

Зарплата бюджэтнікаў, пенсіі і дапамогі ў гэтым годзе будуць неаднаразова павышаны, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Рост дабрабыту народа — адна з галоўных мэтаў нашай палітыкі, адзначыў ён. Даходы грамадзян працягваюць расці. «Мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць людзей, якія знаходзяцца ў няпростых жыццёвых умовах», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Так, у апошнія гады ўтварыўся істотны разрыў паміж аплатай працы ў бюджэтнай сферы і ў народнай гаспадарцы ў цэлым. Сёння гэтыя суадносіны складаюць каля 80%, а аптымальна павінна быць не менш за 90%, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Пагадзіцеся, не павінен настаўнік альбо медыцынскі работнік адчуваць сябе непаўнавартасным перад работнікамі іншых сфер». На гэты год у бюджэце закладзена неаднаразовае павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду бюджэтнікаў, пенсій і дапамог.

У той жа час няма і не можа быць падстаў для росту цэн, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «Ураду, Нацыянальнаму банку і мясцовым органам улады выказана маё жорсткае патрабаванне — ажыццяўляць цэнавае рэгуляванне больш эфектыўна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння ў Беларусі няма і быць не можа падстаў для росту цэн. Любыя факты іх павышэння звыш прагнознага ўзроўню, асабліва на спажывецкія тавары, павінны быць прадметам неадкладнага разбору».

Паводле слоў Прэзідэнта, унутраны рынак варта рашуча зачысціць ад усіх, хто спрабуе нажыцца за кошт звышпрыбытку, карыстаючыся сваім дамінуючым і не толькі дамінуючым становішчам. Гэтак жа неабходна сачыць і за коштамі ў ЖКГ. Трэба ўзяць на кантроль выдаткі літаральна кожнай структуры ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, электраэнергетыцы, газавай галіне. Абгрунтаванасць выдаткаў на кожным этапе цэнаўтварэння павінна кантралявацца самым жорсткім чынам, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«На практыцы неабходна кіравацца добра вядомым правілам: цэны хутка растуць у тых, хто злоўжывае сваім становішчам на рынку, хто нядбайна і безадказна лічыць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Маё патрабаванне да ўрада і Нацыянальнага банка застаецца нязменным. Рост спажывецкіх цэн за год не павінен перавышаць прагнозны. Лепш, калі ён будзе каля 10%. Гэта што, мала?!».

«Я заўсёды падтрымліваў урад: так, трэба выраўнаваць, трэба падцягнуцца, таму што цэны ў Расіі — такія, на Захадзе — такія. І не трэба працаваць дарма, на нейкага дзядзьку, за бясцэнак прадаваць сваю прадукцыю. Хопіць, трэба спыніцца, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Пасля пасяджэння ва ўрадзе шмат хто ў грамадстве пачаў пагаворваць: маўляў, Прэзідэнт сказаў, а Мясніковіч з камандай зробіць што захоча. І ўсё сыдзе ў пясок».

Звяртаючыся да прэм'ер-міністра, кіраўнік дзяржавы працягнуў: «Міхаіл Уладзіміравіч, красавіцкія звесткі кажуць аб тым, што ў нас усё-такі сітуацыя з цэнамі больш-менш стабілізавалася. Таму скажу тым, хто кажа: калі Прэзідэнт сказаў, то так і будзе, рана ці позна». «Прычым рана ці позна будзе — залежыць не толькі ад Мясніковіча, але і ад кожнага чалавека на кожным працоўным месцы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Запрагайце і цягніце — тады будзеце багатымі. І кожны вечар, кладучыся спаць, кожны грамадзянін краіны павінен падумаць: а што я зрабіў за гэты дзень такога, каб заўтра запатрабаваць ад Лукашэнкі вышэйшую зарплату, пенсію або дапамогу, каб заўтра жылося лепш, каб наогул багацейшым быў сам і краіна? Вось калі ты будзеш задаваць сабе гэтае пытанне і хоць бы працэнтаў на 50 шчыра адказваць на яго, тады ты мне прэтэнзіі прад'яўляць не будзеш».

Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў урад за правал асноўных паказчыкаў энергаэфектыўнасці. Ён нагадаў, што неабходна дасягнуць зніжэння энергаёмістасці ВУП на 29-31% да ўзроўню 2010 года, у тым ліку сёлета знізіць энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту на 7%.

Больш увагі варта надаваць развіццю аднаўляльных крыніц энергіі, павелічэнню долі ўласных энергарэсурсаў, асваення нетраў. «Задача заключаецца ў тым, каб штогод нарошчваць аб'ёмы мясцовых відаў паліва і выйсці да канца пяцігодкі на ўзровень 30% аб'ёму вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі за кошт уласных рэсурсаў, гэта залог нашай энергетычнай бяспекі», — падкрэсліў ён. Пры гэтым нельга забываць, што транжырства, безгаспадарчасць, нямэтавае расходаванне сродкаў цяжкім цяжарам кладуцца на сабекошт прадукцыі, пагаршаючы эканамічны стан канкрэтнага прадпрыемства і наносячы сур'ёзную шкоду ўсёй дзяржаве, заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Праверкі кантралюючых органаў паказваюць, што нярэдкія яшчэ выпадкі, калі закупленае імпартнае абсталяванне, на якое затрачаны вялікія валютныя сродкі, валяецца гадамі без прымянення. Тыповай стала і такая сітуацыя, калі адны прадпрыемствы па імпарце закупляюць металалом, а ў іншых безгаспадарнымі іржавеюць горы гэтай каштоўнай сыравіны або яна аддаецца на водкуп розным прайдзісветам.

«Але асабліва абурае людзей, калі, на словах заклікаючы калектыў да эканоміі, той ці іншы кіраўнік прадпрыемства, якое загразла ў даўгах як у шаўках, купляе сабе любімаму дарагія іншамаркі, уладкоўвае свае дамы, стварае шыкоўныя службовыя кабінеты», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Каб спыніць такія з'явы, Прэзідэнту прыйшлося нядаўна прымаць адпаведныя рашэнні.

## ДЗЯРЖПАДТРЫМКА Ў ЖЫЛЛЁВАЙ СФЕРЫ БУДЗЕ СТРОГА АДРАСНАЙ

Што тычыцца дзяржаўнай дапамогі ў жыллёвым будаўніцтве, то яна будзе не толькі адраснай, але і жорстка кантраляванай у дачыненні да яе мэтавага выкарыстання. «Мы ўстанаўліваем жорсткія патрабаванні пры здачы ў арэнду жылля, пабудаванага з дзяржаўнай падтрымкай. Сёння пабудаваў па льготных крэдытах жыллё, а заўтра здае ў арэнду і атрымлівае ад гэтага прыбытак — дык навошта дапамагалі гэтаму чалавеку, калі яму жыллё не трэба?».

«Свая кватэра, свой дом, свой дах над галавой павінна быць у кожнай сям'і. Менавіта таму ў мінулыя гады мы нават насуперак законам макраэканомікі ўкладвалі каласальныя сродкі ў будаўніцтва жылля», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што сотні тысяч сем'яў абзавяліся жыллём дзякуючы вельмі моцнай дзяржаўнай дапамозе. «Мы будавалі ў сярэднім каля 5 млн. кв.м жылля ў год. Прычым больш за палову з іх — для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па гэтых пазіцыях мы апярэджваем усе краіны СНД», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў: «Прамая дзяржаўная падтрымка грамадзян у забеспячэнні жыллём захоўваецца сёння і будзе захавана надалей. Але яна становіцца больш адраснай, якая ўлічвае рэальныя фінансавыя магчымасці грамадзян. Аказваць яе будзем толькі тым, хто ў ёй сапраўды мае патрэбу». Па даручэнні Прэзідэнта да красавіка гэтага года ўдакладнены спісы такіх сем'яў, у выніку з уліку знята 85 тыс. грамадзян, якія не мелі права быць у ліку чаргавікоў.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што з бягучага года для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу, жыллё будуецца па дзяржзаказу. «Гэта значыць, спачатку жылы дом будзе пабудаваны. Затым ужо гатовае жыллё будзе прадастаўляцца грамадзянам па цэнах, якія склаліся на дату ўводу дома ў эксплуатацыю, з выдачай ільготнага крэдыту», — растлумачыў ён. Таксама пашыраюцца магчымасці грамадзян самастойна вырашаць сваё жыллёвае пытанне. «Ствараем сектар арэнднага жылля, павялічваем долю індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад урада, мясцовых органаў улады перагледзець існуючыя нормы праектавання як па шчыльнасці забудовы, так і па колькасці парковачных месцаў. «Жыллё ў нашай краіне павінна быць не толькі даступным, але і зручным. І сёння гэтыя пытанні ад грамадзян гучаць усё вастрэй. Перш за ўсё людзі скардзяцца на адсутнасць парковак, праславутае ўшчыльненне забудовы. Дарэчы, гэтыя два пытанні ўзаемазвязаныя паміж сабой, — адзначыў кіраўнік дзяржавы . — Так, недзе трэба і ўшчыльняцца, недзе трэба і паркоўкі будаваць, але толькі ў інтарэсах людзей і дзяржавы, а не таго, хто сёння прыйдзе і вам прапануе нейкі праект. На ўшчыльненне ісці толькі ў крайнім выпадку. З гэтай нагоды таксама прынята адпаведнае рашэнне».

Прэзідэнт лічыць, што ў краіне трэба энергічней будаваць шматузроўневыя і падземныя паркінгі. Акрамя таго, неабходна прыняць дадатковыя меры па пашырэнні пляцовак для часовай паркоўкі легкавых аўтамабіляў на прыдамавых тэрыторыях жылых дамоў. «І гэта трэба рабіць неадкладна. Сёння вы бачыце, што сям'я ўжо мае па два-тры аўтамабілі, і так у Мінску амаль у паловы насельніцтва. Дык стварыце ім нармальныя ўмовы, яны заплацяць, каб машыны захоўваліся там, дзе трэба. Мы дамаўляліся на ўездах, выездах бліжэй да кальцавой дарогі, стварыце гэтыя сегменты. Не трэба, можа, бетаніраваць ды асфальтаваць, засыпце добранька друзам і няхай ставяць аўтамабілі. Нармальны будзе попыт — заасфальтуем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў АЙЧЫННАЙ ЭНЕРГЕТЫЦЫ?

Там, паводле слоў Прэзідэнта, выяўлена нямала фактаў неэфектыўнага расходавання сродкаў, дрэнная прапрацоўка праектаў мадэрнізацыі, паставак няякаснага, часам кантрафактнага абсталявання.

У прыватнасці, дрэнным прыкладам з'яўляецца мадэрнізацыя Бярозаўскай ГРЭС. У 2008-2011 гадах замежнаму пастаўшчыку быў пералічаны аванс у памеры амаль 20 млн еўра. На сёння прадукцыя так і не паступіла. Праверка «Белпаліўгазу» паказала разбазарванне каля Br54 млрд інавацыйнага фонду Мінэнерга. Кожны чацвёрты ўкладзены рубель не даў належнай аддачы. Сродкі растрачаныя шляхам прыпісак, завышэння аб'ёмаў і кошту выкананых работ. І негатыўныя прыклады можна працягваць, сказаў Прэзідэнт.

Літаральна на днях быў дэталёва прааналізаваны стан спраў у галіне, і прыняты шэраг прынцыповых рашэнняў па навядзенні парадку, у тым ліку кадравых.

## КОЛЬКАСЦЬ ЧЫНОЎНІКАЎ СКАРОЦЯЦЬ

У рамках удасканалення кіраўніцкай сістэмы плануецца скараціць 13617 дзяржаўных служачых, аднак працэс аптымізацыі дзяржапарату не павінен быць механічным. На думку Аляксандра Лукашэнкі, мадэль дзяржаўнага кіравання не павінна адрывацца ад рэальнага стану грамадскіх адносін, таму зараз у Беларусі вядзецца чарговы этап удасканалення кіраўніцкай сістэмы.



Фота БЕЛТА.

«Вядома, з аднаго боку, дзяржаўных служачых у нас няшмат. У такіх супастаўных з нашай краінай, паводле насельніцтва і памераў, дзяржавах, як Аўстрыя, Славакія, Балгарыя, агульная колькасць чыноўнікаў у два разы вышэй, чым у Беларусі. З іншага боку, заклікаючы насельніцтва эканоміць, берагчы рэсурсы, мы не можам дапусціць празмерных выдаткаў на дзяржаўны апарат. Ды гэта і не трэба сёння. Эканомію трэба прадэманстраваць на сваім прыкладзе. У нас ёсць рэзерв, каб скараціцца. У гэтай сувязі 12 красавіка мной падпісаны ўказ, які прадугледжвае скарачэнне колькасці дзяржаўных служачых на 25%, або на 13617 адзінак. Пры гэтым цэнтральныя органы скароцім на 25%, аблвыканкамы — прыкладна на 29%, а раённыя выканаўчыя камітэты — на 17% », — адзначыў Прэзідэнт. «Але скарачэнне не павінна быць бяздумным, механічным, нельга крыўдзіць чалавека. Нельга дапусціць страты ініцыятыўных, адказных работнікаў, якія складаюць аснову дзяржаўнага апарату. У першую чаргу павінны сысці тыя, хто выпадкова трапіў у дзяржаўны апарат або проста не бачыць сябе на дзяржаўнай службе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя скарачэння колькасці дзяржапарату неабходна перагледзець і функцыі дзяржаўных органаў, дадаў Прэзідэнт. «У ведамствах заяўляюць, што шмат працы, «задыхаюцца», а як паглядзіш, то ад паловы функцый трэба было б ужо даўно адмаўляцца і «не задыхацца». У выніку і самі сябе нагружаюць, і насельніцтва, і прадпрыемствы пакутуюць. Адразу кажу, усе зэканомленыя на скарачэнні дзяржаўнага апарату грошы аддамо на павышэнне заробкаў дзяржаўным служачым. Чалавек, які прысвячае сябе службе дзяржаве і пазбаўлены іншых магчымасцяў зарабляць, павінен быць здольным утрымліваць сябе і сваю сям'ю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што яго інфармуюць пра нейкае напружанне ў калектывах дзяржслужачых у сувязі са скарачэннямі. «Хтосьці там на Прэзідэнта крыўдзіцца. Я падкрэсліваю: мы нікога не пакрыўдзім. Усе тыя, хто варты служыць у дзяржапараце народу і дзяржаве, — будуць занятыя і задзейнічаныя. Тыя, хто выпадкова трапіў (хай і таленавіты чалавек, але выпадкова трапіў), — мы абавязкова дадзім ім працу. Таму не трэба больш мне пісаць пра тое, як рэагуюць на гэты ўказ дзяржаўныя служачыя. Я добра ведаю, як рэагуюць. Усё пройдзе, перамелецца, і яшчэ будуць казаць дзякуй, што было прынята такое рашэнне. Работы ў краіне хапае ўсім», — заявіў Прэзідэнт.

## ДАРОГУ — ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

Адміністрацыі Прэзідэнта сумесна з урадам і ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» даручаецца прадумаць новую сістэму выяўлення таленавітай моладзі і яе вылучэння на значныя пазіцыі, у тым ліку ў дзяржапараце, заявіў Прэзідэнт. «Мы заўсёды імкнуліся падтрымліваць моладзь і актыўна прыцягваць яе да дзяржаўнага будаўніцтва. Але сёння, думаю, прыйшоў час для нейкіх новых, больш фундаментальных рашэнняў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Даручаю Адміністрацыі Прэзідэнта сумесна з урадам і нашай найбуйнейшай моладзевай арганізацыяй — БРСМ прадумаць новую сістэму выяўлення маладых таленавітых людзей і іх вылучэння на вядучыя пазіцыі і ў дзяржаўным апараце, і на прадпрыемствах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт адзначыў, што значэнне моладзі было вялікае ў любую эпоху, але ў XXI стагоддзі яно вырасла на парадак. «Карэнная прычына простая — фантастычна хуткімі тэмпамі састарваюцца веды і набытыя навыкі. Узнікаюць галіны навукі і цэлыя галіны эканомікі, якіх ніколі не было раней», — растлумачыў ён.

## ПАДТРЫМКА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ

«Нашы галоўныя задачы ў сферы культурнай палітыкі ў тым, каб, па-першае, падтрымліваць патрыятычную лінію ў беларускай культуры, ствараць умовы для развіцця яе традыцыйных і сучасных напрамкаў і, па-другое, выкарыстоўваючы гэты патэнцыял, умацоўваць міжнародны прэстыж краіны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што для вырашэння гэтых задач, акрамя адкрыцця Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, трэба правесці нямала работы. «У прыватнасці, урад і абласныя выканаўчыя камітэты павінны прыняць меры па адраджэнні ўнікальных беларускіх рамёстваў і стварэнні на іх базе сучаснай сувенірнай індустрыі, Міністэрства культуры — напоўніць новым зместам міжнародныя фестывалі,ператварыўшы іх у заканадаўцаў творчай моды на прасторы СНД, урад і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт павінны ў сціслыя тэрміны вырашыць пытанне стварэння арт-цэнтра актуальнага мастацтва ў Мінску з улікам сусветнага вопыту і правесці на яго базе ў 2014 годзе маштабную выстаўку, якая стане часткай культурнай праграмы хакейнага чэмпіянату», — адзначыў кіраўнік дзяржавы

У гэтай сувязі Прэзідэнт лічыць, што неабходна паспяшацца са стварэннем беларускага нацыянальнага спартыўнага тэлеканала, пры гэтым не дапускаючы скарачэння спартыўнага вяшчання на іншых дзяржаўных каналах. «Спартыўнае вяшчанне на дзяржаўных тэлеканалах вымушае жадаць лепшага. Неабходна хутчэй варушыцца ў пытанні стварэння беларускага нацыянальнага спартыўнага або культурна-спартыўнага канала. Пры правільным падыходзе да справы — гэта вельмі магутны рэсурс для развіцця беларускага спорту, асабліва гульнявых відаў, прыцягнення ўвагі рэкламадаўцаў, спонсараў і балельшчыкаў. Аднак пры гэтым недапушчальна скарачэнне спартыўнага вяшчання на іншых дзяржаўных каналах. Прапаганда здаровага ладу жыцця лішняй не бывае», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ў цэлым у спартыўнай сферы нямала пытанняў. «Мы ўкладваем вялікія сродкі ў спартыўную галіну, а ўсё яшчэ далёкія ад адчувальных рэзультатаў. У выніку давялося пайсці на крайнія меры, змяніць усё кіраўніцтва галіны, прыняць шэраг рашэнняў па гульнявых клубах. Ад новага кіраўніцтва я чакаю выбудоўвання дакладных прыярытэтаў развіцця спорту. У іх аснове павінен быць галоўны прынцып: любое ўзнагароджанне — толькі за вынік», — лічыць Прэзідэнт.

Ён упэўнены, што неабходна пачынаць сур'ёзна працаваць у спартыўнай галіне. «Уся праблема ў трэнерах. Яны павінны працаваць хаця б як настаўнікі ў школах. Ёсць праграма, ёсць расклад, ёсць людзі. Асабліва ў гульнявых відах спорту бацькі гатовы плаціць і плаціць шмат. Ды і плацяць, толькі дзе гэтыя грошы? У бліжэйшы час мы на гэта пытанне адкажам, але будзе вельмі сумна і балюча, калі праз следчы ізалятар», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт закрануў таксама тэму чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, які пройдзе ў Беларусі. «Гэта вельмі важная для Беларусі спартыўная падзея, і яна ўжо блізка. Мы павінны падрыхтаваць да бездакорнай работы ўсю інфраструктуру маючага адбыцца чэмпіянату. Нам ужо сёння неабходна думаць аб падрыхтоўцы кваліфікаванага персаналу камунальных і прыватных устаноў харчавання, гасцініц, спартыўных аб'ектаў. Ён павінен быць не горшы, чым у іншых краінах. І гэта трэба не толькі для таго, каб правесці гэтыя два тыдні, адстраляцца, а потым даць справаздачу. Трэба зрабіць так, каб абслужыць прыехаўшых да нас людзей так, каб яны сказалі: «Так, гэта зусім іншая краіна, чым мы там у сябе чытаем». І каб іншым захацелася сюды прыехаць. Мы ж для гэтага ствараем усю інфраструктуру. Для ўрада і Мінскага гарвыканкама — гэта экзамен», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Памятаю яшчэ, як аднойчы раніцай па дарозе на працу ўбачыў, што ўсе запасныя пуці нашай чыгуначнай станцыі да адказу забітыя вымытымі таварнымі вагонамі. Падумаў: «Няўжо ў эвакуацыю? Няўжо і нам, усім мазыранам?».

Не ведаў тады, а многія не ведаюць дагэтуль, што пасля выбуху на чацвёртым блоку АЭС стварылася рэальная пагроза яшчэ аднаго — больш магутнага. У сувязі з чым на сумесным пасяджэнні бюро ЦК КПБ і Саўміна БССР было прынята рашэнне аб эвакуацыі ўсёй Гомельскай вобласці. Насельніцтва Мазыра, дарэчы, планавалася вывезці ў Брэст.

На шчасце, пагроза мінула: яе самаахвярна прадухілілі ваенныя лётчыкі, якія «глушылі» аварыйны рэактар з паветра (у далейшым многія з іх памерлі ад апраменьвання), метрабудаўцы, будаўнікі і іншыя спецыялісты, якія падвялі пад рэактар сістэму ахалоджвання з вадкім азотам і зрабілі так званую бетонную падушку...

Штодзень на ліквідацыі катастрофы і яе наступстваў працавалі да 20 тысяч чалавек — пажарных, вайскоўцаў, лётчыкаў, вадзіцеляў, медработнікаў... Усім ім нізкі паклон, а тым, каго ўжо няма, — вечная светлая памяць!

...Ездзілі ў зону і мы, пераважна — на сельгасработы. Асабліва запомнілася ўборка буракоў ля вёскі Цешкаў Нараўлянскага раёна. Караняплоды там выраслі такія, што аднаму не падняць было, не закінуць у кузаў прычэпа.

Людзі, што працавалі на тых палях, у тых лясах, скардзіліся на слабасць, на галаўны боль, на пяршэнне ў горле, на сверб цела, на пастаянную смагу...

Праз пяць гадоў пасля катастрофы мая дачка перанесла аперацыю на шчытападобнай залозе і цяпер пажыццёва вымушана прымаць лекі. А крыху пазней захварэла жонка, якая неаднаразова ў загадным парадку накіроўвалася ў забруджаную радыенуклідамі зону на сельгасработы: яе мучылі неймаверныя болі ў суставах, ад якіх не дапамагала нішто. Усё перабралі! Заставалася адна надзея — на Бога. Але і ён аказаўся бяссільным: 16 сакавіка спаўнілася пяць гадоў, як жонкі не стала.

Вось ён, той чорны след, што пакінуў Чарнобыль у маёй сям'і. І ў безлічы іншых — таксама...

**Уладзімір ЖУРАЎСКІ,**

*г. Мазыр*

■

■ Сустрэчы

# А БЫЛІ МЫ ПРОСТА ВЕРА І ПРОСТА ВАЛЕРА...

**Цяжка паверыць, але прайшло паўвека: у далёкім ужо 1963-м, мы, 38 хлопцаў і дзяўчат, скончылі геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пра далейшае амаль не думалі — на працу ехалі туды, куды размеркавалі. І траплялі такім чынам у розныя галіны народнай гаспадаркі — і ў нашай краіне, і за яе межамі.**

Працавалі, як і вучыліся, добрасумленна: 8 выпускнікоў курса — Ядзя Сельская, Федзя Пятровіч, Вера Герасімёнак, Пеця Рогач, Жора Рылюк, Валера Аношка, Галя Кавальчук і Жанна Капілевіч — абаранілі кандыдацкія дысертацыі, трое выпускнікоў сталі нават дактарамі навук, трое — выдатнікамі народнай асветы... Многія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Найбольшых поспехаў дасягнуў, відаць, Валера Аношка. Ён у нас доктар геаграфічных навук, прафесар Белдзяржуніверсітэта, старшыня геаграфічнага таварыства Беларусі, выдатнік народнай асветы. Узнагароджаны медалём Францішка Скарыны.

Не адстала ад яго і Галя Кавальчук: абараніла дысертацыю доктара біялагічных навук, шмат гадоў працавала ў Акадэміі навук, а зараз — прафесар Мінскага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

Наш выпускнік у свой час працаваў намеснікам у славутага Бядулі, у вядомым на ўвесь Савецкі Саюз калгасе «Савецкая Беларусь». Ваня Гурда не Герой Сацыялістычнай Працы, як старшыня, але ж узнагароды таксама мае.

Зрэшты, не працай адзінай, як той казаў... Самай шматдзетнай матуляй стала выдатніца народнай асветы Вольга Гаварко: у яе чацвёра дзяцей, і яе малодшы сын, дарэчы, таксама скончыў геаграфічны факультэт. Прыкладам для іншых быў і застаецца староста курса Пеця Рогач: ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, працуе дацэнтам Беларускага эканамічнага ўніверсітэта і дапамагае гадаваць аж пяцёра ўнукаў...

Ну, вядома ж, ёсць што расказаць і пра іншых аднакурснікаў, аднак яшчэ цікавей будзе сустрэцца — 20 красавіка, праз 50 гадоў пасля выпуску.

**Зінаіда ПАЎЛЮКОВА,**
**былы сакратар камсамольскай арганізацыі курса.**

*г. Мінск*

■

■ Чалавек чалавеку

# СОРАМНА НЕ ВЕДАЦЬ...

**...Вельмі рада, што мая газета па-ранейшаму застаецца роднай і на роднай мове, бо не хапае цяпер беларускага слова — асабліва ў вялікіх гарадах.**

Мне (ды і, напэўна, усім неабыякавым беларусам) хацелася б бачыць яго на шыльдах (не ад выпадку да выпадку, а ўсюды), чытаць на цэнніках і этыкетках, чуць на вуліцах, у транспарце, у крамах, на працы, у перадачах радыё і тэлебачання. Нам хацелася б жыць, так бы мовіць, у аўры, у атачэнні сапраўды самай мілагучнай у свеце роднай мовы... Але гэтага няма і, баюся, не будзе, бо мы паспяхова ідзём да таго, што першая дзяржаўная паступова знікае.

Як жа не дапусціць гэтага, як захаваць гэты скарб?

Мяне вельмі засмучае, што дзяцей цяпер аддаюць у школы, дзе навучанне ідзе па-руску... Мне здаецца, што такім бацькам трэба неяк даводзіць, што чым больш моў ведае чалавек, тым больш ён дасведчаны, адукаваны... А не ведаць мову папярэднікаў, нашых прадзедаў, людзей, якія раней жылі на гэтай зямлі, па меншай меры сорамна.

...Рада за «Звязду», удзячна журналістам за многія нумары і артыкулы. Вельмі хачу, каб іх было як мага больш. І, адпаведна, больш чытачоў-падпісчыкаў, больш беларускасці, за якую, як мне здаецца, газеце можна дараваць нават залішнюю часам рэкламу...

**Соф'я КАНАНОВІЧ,**

*г. Мінск.*

# ХВОСЦІК ІХ ЧАКАЎ...

**Цяжкая сёлета зіма. І выпрабаваннем яна не толькі для людзей — балюча было глядзець на здымкі буслоў, якія ціснуліся да сметнікаў, да хат у надзеі дачакацца цяпла...**

У сувязі з гэтым успомнілася, як тры гады таму мы, супрацоўнікі бібліятэкі, падабралі савяня, якое вывалілася з гнязда — маленькае, жоўтавокае. Яно не магло яшчэ лятаць, не магло знайсці сабе ежы. Ды і бацькі яго некуды зніклі.

Мы назвалі яго Савеліем, кармілі здробненым курыным мясам, паілі вадой з лыжачкі, знайшлі клетку. Удзень выпускалі на волю, і савяня тупала ў нас па падлозе, сядзела на сталах, на падаконніку.

На выхадныя даводзілася забіраць яго дадому. Унукі рады былі, стаялі тады вакол клеткі, размаўлялі з Савеліем. Што самае дзіўнае, ён нешта адказваў!

Ноччу было цяжэй: малое не спала — тупала, гугукала да той пары, пакуль хто-небудзь не адзываўся. Потым на нейкі час заціхала — і зноў за сваё.

Парад, дапамогі для Савелія мы шукалі ў гуртку юных натуралістаў, у інспекцыі прыродных рэсурсаў, у спецыяліста Негарэльскага вучэбна-доследнага лясгаса Віктара Уладзіміравіча Ярашука. Ён і забраў нашага гадаванца да сябе, потым перадаў у Мінскі заапарк. Хочацца спадзявацца, што Савелій і цяпер жыве, што помніць...

Чаму кажу пра памяць? Неяк у лютым ля крамы наша супрацоўніца падабрала маленькага нічыйнага сабачку, які дрыжэў ад холаду...

Прыгрэлі гэтага бедака дзве дзяўчыны — Марына і Света. Самі яны жылі ў здымным пакоі, але ж, як той казаў, дзе цесна, там пацешна. Сабачка палюбіў іх і ўсюды хадзіў следам, таму дзяўчаты празвалі яго Хвосцікам.

І ўсё б у іх было добра, але аднойчы сабачка знік. Дзяўчаты вельмі хваляваліся, усюды шукалі яго, аж пакуль адна не сасніла сон, у якім Хвосцік чалавечым голасам прасіў: «Забяры мяне з прытулку».

Нараніцу дзяўчаты паехалі туды... Хвосцік сапраўды чакаў! А як жа рады быў! Без слёз не раскажаш...

Цяпер ён падрос, але звычак сваіх не змяніў: на выхадныя (Хвосцік ёсць Хвосцік) дзяўчаты па чарзе возяць яго ў госці да сваіх бацькоў.

**Таіса КОЦІК,**

*г. Дзяржынск*

■

# Нёман разліўся




Фота Васіля ЗЯНЬКО, г. Стоўбцы.

# ДАДАТКОВЫЯ ВАКАЦЫІ

Школьнікі з вёскі Хлупін Жыткавіцкага раёна атрымалі пазапланавы адпачынак. Вуліца, на якой размяшчаецца іх вучэбна-выхаваўчая ўстанова, апынулася ў зоне падтаплення. Менавіта таму, па дамоўленасці з бацькамі, заняткі часова адмянілі. З-за аддаленасці вёскі ад іншых былі вымушаны адмовіцца ад магчымасці падвозу дзяцей для навучання ў суседнія школы раёна, паведамілі ў Жыткавіцкім райвыканкаме. Больш чым 60 выхаванцаў саду і навучэнцаў школы будуць чакаць, пакуль вялікая вада сыдзе. Тым часам сітуацыя ў вёсцы застаецца стабільнай і жыццядзейнасць не парушана. Па звестках прэс-службы абласнога ўпраўлення МНС, зараз на тэрыторыі Гомельскай вобласці падтоплена талымі і паводкавымі водамі каля 1600 падворкаў, 240 жылых дамоў, 28 участкаў дарог. Адселена 19 чалавек. Сітуацыя адсочваецца ў кругласутачным рэжыме.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

МТБанк

Наименование банка:

## ЗАО «МТБанк», г. Минск

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 г.** (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2012 г. | 2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 217 456,0 | 104 282,8 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 0,0 | 0,0 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 | 435 740,6 | 206 484,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 4 | 250 075,9 | 438 391,9 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3 | 99 451,8 | 128 361,4 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 2 270 593,1 | 932 247,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 2,4 | 22,8 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 243,9 | 0,0 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6 | 62 280,2 | 41 022,5 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 8,7 | 8,7 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 7 | 79 675,5 | 37 372,3 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | | 3 415 528,1 | 1 888 194,7 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 8 | 16 903,0 | 48 662,1 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 9 | 379 418,3 | 247 085,0 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 10 | 2 549 086,8 | 1 299 101,6 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 11 | 97 953,0 | 37 589,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 12 | 55,8 | 12,7 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 13 | 44 946,0 | 29 530,2 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3 088 362,9 | 1 661 980,8 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 14 | 121 857,5 | 121 857,5 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 12 532,6 | 12 532,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 16 | 25 727,4 | 18 796,7 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 15 | 167 047,7 | 73 027,1 |
| 28 | Всего капитал | 121 | | 327 165,2 | 226 213,9 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 3 415 528,1 | 1 888 194,7 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2012 год** (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2012 г. | 2011 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 316 697,0 | 151 138,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 237 841,0 | 86 901,7 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 17 | 78 856,0 | 64 237,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 271 556,0 | 101 210,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 19 304,0 | 18 016,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 18 | 252 252,0 | 83 193,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 0,0 | 0,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 20 | 1 631,1 | 711,5 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 19 | 42 826,6 | 43 536,4 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 244,3 | 9 407,8 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 21 | 62 027,7 | 21 377,7 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 22 | 16 703,5 | 6 043,7 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 23 | 186 422,6 | 88 376,9 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 24 | 34 443,8 | 8 917,2 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 109 619,4 | 88 458,0 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 15 598,8 | 15 243,7 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 94 020,6 | 73 214,3 |
| 16 | Базовая прибыль на простую акцию | | | 0,66 | 0,90 |
| 17 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | 0,66 | 0,90 |

**ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2012 год** (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1. | Остаток на 1 января 2011 г. | 3011 | 65 116,5 | 0,0 | 12 532,6 | 39 176,8 | 4 853,3 | 121 679,2 |
| 1.1. | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | | | | | | |
| 2. | Изменения статей капитала | 3012 | 56 741,0 | 0,0 | 0,0 | 33 850,3 | 13 943,4 | 104 534,7 |
| 2.1. | В том числе: совокупный доход | 30121 | * | * | * | 73 214,3 | 13 943,4 | 87 157,7 |
| 2.2. | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 0,0 | * | 0,0 | 0,0 | * | 0,0 |
| 2.3. | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 56741,0 | 0,0 | * | -39 364,0 | * | 17 377,0 |
| 2.4. | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 56 741,0 | 0,0 | * | * | * | 56 741,0 |
| 2.5. | выплата дивидендов акционерам | 301232 | * | * | * | -39 364,0 | * | -39 364,0 |
| 2.6. | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 0,0 | * | * | * | * | 0,0 |
| 2.7. | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 2.8. | прочие изменения | 30126 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 3. | Остаток на 1 января 2012 г. | 3013 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 73 027,1 | 18 796,7 | 226 213,9 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4. | Остаток на 1 января 2012 г. | 3011 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 73 027,1 | 18 796,7 | 226 213,9 |
| 5. | Изменения статей капитала | 3012 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 94 020,6 | 6 930,7 | 100 951,3 |
| 5.1. | В том числе: совокупный доход | 30121 | * | * | * | 94 020,6 | 6 930,7 | 100 951,3 |
| 5.2. | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | 0,0 | * | 0,0 | 0,0 | * | 0,0 |
| 5.3. | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 0,0 | 0,0 | * | 0,0 | * | 0,0 |
| 5.4. | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 0,0 | 0,0 | * | * | * | 0,0 |
| 5.5. | выплата дивидендов акционерам | 301232 | * | * | * | 0,0 | * | 0,0 |
| 5.6. | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 0,0 | * | * | * | * | 0,0 |
| 5.7. | перераспределение между статьями капитала | 30125 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 5.8. | прочие изменения | 30126 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| 6 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3013 | 121 857,5 | 0,0 | 12 532,6 | 167 047,7 | 25 727,4 | 327 165,2 |

**СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2012 год** (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 5 |
| 1 | Прибыль за отчетный период | 301211 | | 94 020,6 | 73 214,3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | | 6 930,7 | 13 943,4 |
| 2.1. | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 6 930,7 | 13 943,4 |
| 2.2. | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | | |
| 2.3. | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | | |
| 2.4. | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | | |
| 2.5. | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | | |
| 3 | ИТОГО совокупный доход за отчетный период | 30121 | | 100 951,3 | 87 157,7 |

**ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2012 год** (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт прим. | 2012 | 2011 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 5 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 301 349,4 | 140 727,1 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | -233 748,6 | -77 944,0 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 246 217,0 | 98 932,0 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | -19 355,2 | -17 935,0 |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 1 631,0 | 711,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 38 925,9 | 12 932,4 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 244,0 | 9 407,8 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 15 882,4 | 5 502,9 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | -212 255,7 | -94 240,1 |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | -15 599,0 | -15 243,7 |
| 13 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах | 701 | | 123 291,2 | 62 850,9 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 72 477,2 | 79 694,9 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 181 651,0 | -209 313,4 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 25 461,8 | 12 254,5 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | -1 244 786,1 | -184 659,0 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 20,8 | -22,8 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | -216 654,5 | 53 697,1 |
| 20 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | -1 181 829,8 | -248 348,7 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | -30 180,0 | -30 050,0 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 114 079,9 | -57 445,5 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 1 092 955,3 | 387 854,0 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 62 241,5 | 1 464,6 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | 43,3 | -2 219,0 |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 130 110,6 | -7 193,1 |
| 27 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | 1 369 250,6 | 292 411,0 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 310 712,0 | 106 913,2 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71100 | | -21 065,2 | -16 026,7 |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71101 | | -1,0 | 34,1 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | -244,0 | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | -21 310,2 | -15 992,6 |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | 56 741,0 |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | -39 364,8 |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 0,0 | 17 376,2 |
| 43 | Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 7 021,3 | 75 569,2 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 296 423,1 | 183 866,0 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 1 | X | 282 297,0 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 1 | 578 720,1 | X |

**Руководитель** **А.К. Жишкевич**

**Главный бухгалтер** **В.В. Ермолович**

**Дата подписания «1» февраля 2013 г.**

**Данные отчеты размещены на сайте www.mtbank.by.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 22 декабря 2012 года.

ERNST & YOUNG

**Ernst & Young LLC**
Korol Street, 51, 2nd floor, office 30
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 209 4535
Fax: +375 (17) 209 4534
www.ey.com/belarus

**ИООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30
Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

**Аудиторское заключение**
**независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг»**
**по публикуемой годовой отчетности ЗАО «МТБанк»,**
**подготовленной по итогам деятельности за 2012 год**

Акционерам, Наблюдательному совету ЗАО «МТБанк» и Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой публикуемой годовой отчетности Закрытого акционерного общества «Минский транзитный банк» (далее «Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2013 года, соответствующих отчетов о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за год по указанную дату. Данная публикуемая годовая отчетность составлена на основании годовой финансовой отчетности Банка с целью его обязательной публикации, в соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 января 2013 года № 19 «Об утверждении инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга». Годовая финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

*Ответственность руководства за годовую финансовую отчетность и публикуемую годовую отчетность*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и представление годовой финансовой отчетности и прилагаемой публикуемой годовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой финансовой отчетности и прилагаемой публикуемой годовой отчетности, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

*Ответственность Аудиторской организации*

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной публикуемой годовой отчетности во всех существенных аспектах в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 года № 3373-XII и Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной публикуемой годовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в публикуемой годовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения публикуемой годовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения публикуемой годовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления публикуемой годовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Мнение*

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая годовая отчетность, составленная на основании годовой финансовой отчетности Банка, достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2013 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507 «Об утверждении инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Поясняющий пункт*

Прилагаемая публикуемая годовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, прилагаемая публикуемая годовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годовой финансовой отчетности Банка и прилагаемой публикуемой годовой отчетности требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в финансовой отчетности и публикуемой годовой отчетности.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 26 октября 2011 года).

Грушевич Олег Владимирович
Аудитор

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001794 от 26 февраля 2010 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 52 от 7 сентября 2010 года, без ограничения срока действия.

Дата аудиторского заключения: 21 марта 2013 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 21 марта 2013 года.

Председатель Правления ЗАО «МТБанк» Жишкевич А.К.

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» Лащенко П.А.

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY
ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

Харэограф Барыс ЭЙФМАН:

# «У нашым тэатры з мяне кожны здзьмухвае пылінкі»



**Асіліць раман «Браты Карамазавы» за 2 гадзіны? Магчыма! Барысу Эйфману ўдалося прамовіць усе галоўныя думкі Дастаеўскага на мове харэаграфіі. Мова цела можа быць вельмі дакладнай і дапамагае раскрыць псіхалогію герояў, сутнасць іх перажыванняў, нават момант расплаты за грэх. Прэм'ера новага балета знакамітага Тэатра Барыса Эйфмана з Санкт-Пецярбурга, якая адбылася ў Беларусі, выклікала вір эмоцый айчыннай публікі, якая цэніць і разумее сучасную харэаграфію. І сапраўды, без слоў, можна сказаць шмат. А бывае і так, што няма слоў, каб сказаць і патлумачыць тое, што зроблена класна. Таму прывілею разважаць пра сучасны балет, які трымаецца літаратурнай асновы, я пакіну за яго аўтарам:**

## Пра філасофію танца

— Я вельмі шчыры прыхільнік творчасці Дастаеўскага. Гэта пісьменнік, які напоўніў мяне нейкай мудрасцю. Пазнаннем тых страсцей чалавечых, якія я сам у жыцці не перажыў, але дзякуючы творчасці Дастаеўскага я іх спазнаў. Неабходнасць вяртання да рамана «Браты Карамазавы» другі раз у тым, што мы пражылі 18 гадоў, якія былі напоўнены нейкімі падзеямі жыцця, катаклізмамі — палітычнымі, эканамічнымі і маральнымі трансфармацыямі. Сам час падказаў, што трэба зноў вярнуцца да гэтага рамана, каб яшчэ больш пашырыць магчымасці балетнага тэатра, які сёння здольны раскрыць глыбокую філасофію і сказаць тое, што немагчыма перадаць словамі. Мова цела здольная выразіць тое, што знаходзіцца ў глыбіні душы чалавека. Калі параўнаць з папярэдняй пастаноўкай, то харэаграфія на працэнтаў 95 абсалютна новая. Таму што сёння тэатр валодае асаблівай тэхнікай танца, асаблівай выразнасцю, тым, чаго не было 18 гадоў таму. Сёння ёсць акцёры, якія валодаюць новай тэхнікай выказвання ў сучаснай харэаграфіі. Сёння мы валодаем адной з самых сучасных сцэнічных тэхналогій. У нас светлавая апаратура — адна з самых дарагіх з еўрапейскіх тэатраў. Змяніліся шмат якія моманты рэжысёрскага прачытання, многія элементы драматургіі. Я сканцэнтраваўся больш на псіхалогіі кожнага з бартоў, зазірнуў унутр яго душы і прасачыў яго духоўную біяграфію. Таму што ў Дастаеўскага ёсць дзіўнае спалучэнне крымінальнай брутальнай белетрыстыкі з нейкімі вечнымі глыбокімі філасофскімі ідэямі.

...Я думаю, што шмат якім маладым людзям, як нашым артыстам, так і гледачам цікава даведацца, што ёсць такі пісьменнік. І ў гэтым ёсць наша важная місія: мы захоўваем сувязь часоў праз культуру. Моладзь прыходзіць на нашы спектаклі — такія, як «Чайка», «Ганна Карэніна», «Анегін», «Браты Карамазавы», і яна пазнае літаратуру, музыку, таму што гучыць Чайкоўскі, Рахманінаў, Мусаргскі. Гэта адна з важных задач — звязаць час. Пакаленне тых, хто яшчэ ведаў літаратуру, чытаў, з пакаленнем тых, хто не чытае, ці адышоў.

## Пра рэалізацыю ідэй

— У мяне складаны перыяд. Я ўвесь час у пошуку. Не магу сказаць дакладна, што буду ставіць у наступныя тыдні... Ведаеце, у чым праблема нашага тэатра? Мы вельмі залежым ад спадароў імпрэсарыа. Таму што ў нас няма свайго памяшкання тэатра, мы не можам выбудоўваць сваю рэпертуарную палітыку. Значыць, мы павінны залежаць ад тых людзей, якія нас запрашаюць. А калі запрашаюць, то кажуць: «Мы хочам «Ганну Карэніну». Ці «Анегіна». Нейкія спектаклі знікаюць з нашага рэпертуару незаслужана. Прыходзіць новае пакаленне артыстаў, і яны нават не ведаюць шмат якіх спектакляў. Але я хачу стварыць спектакль паводле рамана Фіцжэральда «Ноч пяшчотная». У мяне ёсць дамова з джазменам Ігарам Бутманам, які будзе для мяне рыхтаваць музыку. Можа атрымацца новы варыянт псіхалагічнага джазавага балета, таму што гэтая гісторыя звязаная з фрэйдызмам. У бліжэйшы час я ажыццяўлю гэтую задуму.

У планах — будаўніцтва палаца танца для нашага тэатра. Мы павінны рыхтаваць той рэпертуар, з якім увойдзем у гэты тэатр. Калі станем вольнымі ад густаў нашых імпрэсарыа, будзем ствараць сваю рэпертуарную палітыку. Ёсць 14 спектакляў, з якімі мы зоймем рэпертуарную нішу. Звернемся да старых і будзем ствараць новыя.

Але ў бліжэйшых планах адкрыццё Акадэміі танца ў Пецярбургу, на пачатку новага навучальнага года. Я ўдзячны кіраўніцтву горада і краіны, якія падтрымалі, далі грошы. Гэта будзе абсалютна новая навучальная установа, але не дзеля канкурэнцыі з Ваганаўскай акадэміяй. Гэта альтэрнатыўны рух, спроба новай методыкі падрыхтоўкі сучасных, універсальных артыстаў балета. У ёй будзе школа класічнага танца, школа сучаснага танца. Будзе праца са спортам, мастацкай гімнастыкай. Яе праграма павінна развіваць не толькі тэхналогію, але і інтэлект, артыстызм, каардынацыю.

## Пра салістаў з Беларусі ў творчай сям'і

— Так атрымалася, што ў нашай трупе працуюць артысты з Беларусі. Кожны сезон у нас новы склад салістаў. У гэтым сезоне ў нас пераважна ў салістах выпускнікі беларускай школы. У «Братах Карамазавых» — Мікалай Радзюш, Аляксей Турко, Юрый Кавалёў. Вельмі шкада, што Люба Андрэева не змагла танцаваць прэм'еру ў Мінску: у яе траўма пляча. Мы вельмі задаволены, што выпускнікі беларускай школы прыходзяць да нас у тэатр. Хачу сказаць, што шмат хто з іх вяртаецца ў Беларусь і працягвае сваю кар'еру на сцэне Вялікага тэатра. Я думаю, што такім чынам ідзе ўзбагачэнне двух тэатраў. Таму што артысты, якія вяртаюцца на родную сцэну, даюць ужо беларускаму тэатру новы рытм, новыя ідэі творчасці. Мне радасна, што дырэкцыя Мінскага харэаграфічнага вучылішча і дырэкцыя Вялікага тэатра Беларусі ставіцца да гэтага не негатыўна-раўніва, а з разуменнем. Напрыклад, Юрый Кавалёў, які пратанцаваў у нас 2 гады, вяртаецца ў Мінск. І я перакананы, што партыі, якія ён станцуе на сцэне ўжо Вялікага тэатра Беларусі, будуць зусім іншыя. Ён вельмі вырас і змяніўся. Ён працягне з намі супрацоўнічаць як госць. Але вы ўбачыце яго ў рэпертуары беларускага тэатра — гэта ўжо абсалютна іншы ўзровень.

...Наш тэатр — адна творчая сям'я. Як цыганскі табар. Цыганскі табар — таксама адзіная вялікая сям'я. У нас у тэатры поспех — гэта наш агульны поспех. Кожны поспех, які мы зарабляем сваёй творчасцю, адлюстроўваецца на творчым жыцці нашых акцёраў, на матэрыяльным стане. Я думаю, што кожны супрацоўнік нашага тэатра ад «суперзорак» да машыніста сцэны зацікаўлены ў тым, каб з'яўлялася творчая прадукцыя самай высокай якасці. Таму што ад гэтай прадукцыі, якую мы разам ствараем, залежыць лёс, жыццё і дабрабыт нашых артыстаў і іх сем'яў... Ніколі ў жыцці мы не дойдзем да таго, да чаго дайшоў Вялікі тэатр Расіі. У нашым тэатры кожны будзе здзьмухваць з мяне пылінкі і пытаць: «Як ваша здароўе?» Таму што ад майго здароўя залежыць усё...

**Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.**

# АД КАМПАРТЫІ ДА ХРЫСТА

*Успамінае інак Мікалай (паэт Зьніч)*

**«Божа, дапамажы, але і ты, мужык, не ляжы» — развітваецца са мной інак Мікалай, вядомы многім як паэт Зьніч (у міры Алег Бембель), аўтар рэлігійнай лірыкі. Яшчэ ён сціпла пытаецца, ці хрышчоная, і, пачуўшы, што так, хрышчоная праваслаўная, прамаўляе «Божа, дапамажы!» і запрашае ў госці ў Жыровіцкі манастыр. Я думаю, што абавязкова з'езджу.**

**Інак Мікалай, сын вядомых скульптараў, філосаф па адукацыі, які скончыў яшчэ і кансерваторыю, у пэўны момант адчуў, што Бога трэба ўпусціць у сваю душу. Будучы членам кампартыі, хрысціўся і стаў пісаць рэлігійныя вершы. Таму што паэзія, на яго думку, можа быць толькі ад Бога.**

**Але пра паэзію з ім размаўляць не проста. Для яго паэзія — гэта той від творчасці, пра які складана нешта сказаць наогул. Інак Мікалай адразу пачынае цытаваць свае і чужыя творы, а потым дадае:**

**— З усіх азначэнняў паэзіі, мне больш за ўсё па сэрцы тое, што сказаў Салаухін. Паэзія — гэта павелічальная мова.**

**З самага дзяцінства будучы інак, якому ўхвальныя водгукі пісаў Уладзімір Караткевіч і якому выпала завочна адпяваць паэта Анатоля Сыса, жыў пад уплывам бацькі, скульптара Андрэя Бембеля, і цётухны Анастасіі, роднай сястры маці Вольгі Дзядок. На бацьку ў свой час вельмі паўплывалі камуністычныя атэістычныя погляды, а цётка была шчырай прыхільніцай хрысціянскага камунізму. Вось у такім дуалізме і выхоўваўся будучы паэт Зьніч, інак Мікалай. І ніхто не «насядаў» на яго свабодную волю.**

**Пра гэта, а яшчэ пра падрыхтоўку новай кнігі, пра тое, чаму будучы манах адчайна змагаўся за свой партбілет, як пісаў адкрыты ліст Гарбачову і займаўся самвыдатам, капіруючы свае кніжкі ў ЦК кампартыі, інак Мікалай расказаў «Звяздзе».**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Свабодная воля

— Мая цётачка Анастасія, пад уплывам якой я і прыйшоў да хрышчэння, была прыхільніцай тэорыі хрысціянскага камунізму. Яна лічыла, што камунізм як сацыяльны лад — справа добрая. А тое, што Хрыста адкінулі, яна лічыла «временным заблуждением общества». Яна была перакананая, што камунізм без Хрыста немагчыма пабудаваць, таму што Хрыстос нібыта за бедных быў, казаў, што багатым цяжэй у рай прайсці, чым вярблюду праз ігольнае вушка. З такой устаноўкай яна працавала выкладчыцай тэорыі фізічнага выхавання ў Мінскім інстытуце фізкультуры. Але яе не чапалі, не выганялі з працы. Можа, таму, што яна была ўдава афіцэра, які загінуў у апошнія дні вайны. Можа таму, што пацяпленне было да царквы: былы семінарыст *(Іосіф Сталін —* **Аўт.***)* успомніў, чаму яго вучылі ў семінарыі, у той час калі немец пад Масквой стаяў... Ёй прапанавалі нават уступіць у партыю. Яна сказала: «Калі з Хрыстом мяне прымеце ў партыю, я з радасцю». Ну, чыноўнікі былі збянтэжаны, пару разоў яшчэ прапанавалі і ўжо больш не прыставалі.

— У майго бацькі ў майстэрні часта збіралася «мінская шляхта». Усе размаўлялі, і цётухна мая ў нас бывала. І за сталом усе былі не такія, як з трыбун. Усе чыноўнікі былі ў асноўным вясковыя хрышчоныя хлопцы, якія вайну прайшлі. Я, малы, любіў круціцца каля дарослых і слухаць іх размовы. Не ўсё разумеў, але мне было цікава. У такой атмасферы я рос: паміж падыходам, што Бога няма, і маёй цётачкай, якая была жывым прыкладам адваротнага. Бывала, я вельмі любіў з ёй размаўляць, гадзінамі. Я такі малы, ужо нейкія дыскусіі з ёй вёў, наслухаўшыся і «бязбожных» аргументаў, і цётчыных. Потым я зразумеў, што розныя ёсць пазіцыі, але так «тупа і шэра» сцвярджаць, што Бога няма і дзяржаву на гэтым будаваць, новае пакаленне выхоўваць — нельга.

> **Я зразумеў, што гэта азначае. І вырашыў, што напад — найлепшы спосаб абароны. У тую ж ноч напісаў адкрыты ліст Гарбачову.**

— А бацька не налягаў, не супраціўляўся. У яго тэзіс быў такі: да 30 гадоў вы ўсё падшыванцы, а пасля 30 з вамі пра нешта можна гаварыць. І таму ён лічыў так: маўляў, перабесіцца, няхай, што хоча, пазнае, чытае, дыскутуе, я з ім пасля 30 пагавару. Вось такая атмасфера, у якой я гадаваўся, была пасля вайны. І вось так я прыйшоў, у значнай меры пад уплывам цётачкі, да захаплення філасофіяй. Бацька і цётухна Анастасія сябравалі і часта палка дыскутавалі. І бацькавы аргументы падаваліся небеспадстаўнымі, і цётчыны. Гасподзь так стварыў, што я мог свабодна выбіраць для сваёй душы тое, што трэба. Маю свабодную волю ніхто ніколі не гвалціў.

— У мяне быў унікальны дзед Ануфрый! Ён з бабуляй Стэфанідай 14 дзетак на ногі падняў. І мой бацька Андрэй быў адзін з самых апошніх. Па сённяшніх мерках, яго і блізка да жыцця не падпусцілі б. На пачатку XX стагоддзя сярэдняя колькасць дзетак ва ўсходніх славян была 7 на сям'ю. А цяпер у нас — 1,3... Дык вось дзед Ануфрый з бабуляй Стэфанідай у Веліжы (сёння гэта Смаленшчына) жылі вельмі бедна, але ніхто з голаду не памёр. Старэйшыя дзеці былі афіцэрамі ў Першую сусветную вайну, некаторыя загінулі. Дзед Ануфрый глыбока рэлігійны чалавек быў. І да 300-годдзя Дома Раманавых у 1913 годзе ён нават атрымаў дваранства за багалюбнае выхаванне такой шматлікай сям'і.

## «Я біўся за свой партбілет адчайна!»

— У свой час мне давялося быць аспірантам, а потам працаваць у сектары гісторыі філасофіі ў Акадэміі навук. Там я падрыхтаваў дысертацыю — «Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў духоўнай культуры». У ёй разглядаюцца катэгорыі нацыянальнага і інтэрнацыянальнага як інструменты даследавання культуры. І дысертацыя была ўжо завершана, але яе моцна дзяўблі з усіх бакоў. Яна была напісана на беларускай мове. Гэта само па сабе было выклікам, таму што філасофскія дысертацыі тады па-беларуску не пісаліся. Тым больш, тэма вельмі пякучая. Яе адфутбольвалі з аднаго сектара ў другі. І калі яна ляжала ў сектары сацыяльнай псіхалогіі і эстэтыкі і вось-вось павінна была абараняцца як дысертацыя, у Лондане яна выйшла асобнай кніжкай пад назвай «Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс». Гэта было ў 1985 годзе.

— А загадчыкам сектара сацыяльнай псіхалогіі і эстэтыкі быў тады Уладзімір Конан. І мой навуковы кіраўнік, і хросны бацька. Мяне тайна ў 1982 годзе акурат 13 красавіка хрысціў на сваёй кватэры свяшчэннік Георгій Латушка. Я да гэтага быў вучоным нехрысцем, бунтаўшчыком. Уладзімір Міхайлавіч, будучы ўжо доктарам філасофіі, пагадзіўся быць маім хросным бацькам. А гэта было вельмі рызыкоўна: калі б нас там застукалі, абодвух бы з Акадэміі пагналі, і бацюшку таксама пакаралі б за падпольную дзейнасць. Але Гасподзь пакрыў. І цікава, што ў мяне тады быў стаж члена партыі — 12 гадоў. А Конан быў наогул беспартыйны. Я яму потым яшчэ рэкамендацыю ў партыю пісаў. Дык вось пад яго апекаваннем я і працаваў над дысертацыяй. І тут у Лондане надрукавалі кніжку. Я зразумеў, што гэта азначае. І вырашыў, што напад — найлепшы спосаб абароны. У тую ж ноч напісаў адкрыты ліст Гарбачову пра тое, што мая праца, якую я даўно хачу надрукаваць на радзіме, надрукавана за мяжой. І таму прашу, каб не было непаразуменняў, надрукаваць яе ў нас. Бо яна спрыяе аптымальнаму разуменню суадносін нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў культуры. І ў час перабудовы, якая тады адбывалася, яна будзе вельмі карысным дапаможнікам у рэгуляванні міжнацыянальных адносін у галіне духоўнай культуры. І акурат аказія! Бацькаў сябра ехаў у Маскву. Па пошце, вядома, такое пасылаць было пагібельна. А так я мог перадаць ліст і быў упэўнены, што ўжо раніцай ён трапіць туды, куды трэба.

— І пачалося... Я прасіў Гарбачова паскорыць працэс публікацыі ў нас кнігі. А замест гэтага ў Акадэмію навук была спушчана дырэктыва — правесці пасяджэнне вучонага савета. Я думаў, гэта будзе абмеркаванне маёй дысертацыі на прадмет публікацыі. А гэта склікалі савет, каб аб'явіць маю кніжку антысавецкай. А такая фармулёўка азначала 5-7 гадоў турмы... Але Гасподзь распарадзіўся так, што Яўген Бабосаў, тады дырэктар Інстытута філасофіі і права, настаяў, каб фармулёўка была зменена. Кнігу маю назвалі «не марксісцкай, і нацыяналістычнай». А значыць, крымінал здымаўся. Бабосаў, яшчэ і як старшыня вучонага савета, мяне літаральна ад турмы выратаваў. Потым быў скліканы парткам Акадэміі навук. А я тады быў членам партыі...

— Мяне прынялі ў кампартыю ў 1970 годзе, акурат на стагоддзе Леніна. Было ў чым каяцца будучаму інаку, Госпадзі памілуй... Дык вось у парткаме ўжо не было ніякіх дыскусій. У мяне забралі партбілет нібыта для праверкі партыйных узносаў. Але вяртаць мне яго ніхто не збіраўся. І я адразу падаў апеляцыю ў гаркам партыі. Я біўся за свой партбілет адчайна!

— Апеляцыі я падаваў яшчэ ў абкам, потым у ЦК КПБ. Паўсюль трошку змякчалі фармулёўку прычыны, па якой партбілет у мяне адабралі. У рэшце рэшт, у ЦК адкрытым тэкстам сказалі, што не трэба абвастраць, што праз год мне партбілет вернуць, толькі ў Маскву не трэба. Я паслухаў іх, і, тым не менш, напісаў у Маскву, у камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС. А затое, які мне літаратурны матэрыял Масква дала! Там жа сапраўдныя персанажы былі!

## Пахаванне бацькі

— Прымаў мяне выхадзец з Беларусі. Вельмі далікатна паводзіў сябе. Было відаць, што яму няёмка. Гэта была зіма 1986 года. Я бацьку нядаўна пахаваў. І гэты чыноўнік раптам паказвае мне паперку са словамі: «Гэта прамога дачынення да вашай справы не мае, але я не магу не паказаць». На паперцы напісана: «Считаю своим долгом сообщить, что во время похорон народного художника Беларуси Андрея Бембеля, его сын, Олег Андреевич, расставаясь со своим отцом при погребении, перекрестил его и вложил в руки крестик». На пахаванні былі і члены ЦК, але ніхто не адважыўся мне пярэчыць. Бацька быў хрышчоны і нават да 12 гадоў спяваў на кліросе. Але гэты савецкі бязбожны пераварот на яго вельмі паўплываў, яго закруціла камсамольская вакханалія. Тады многія з бедных сем'яў паддаліся на гэтае. І дзед Ануфрый, па сямейным паданні, нават рэзка асудзіў майго бацьку...

## Пра тутэйшых мудрацоў

